# Бібліяграфія

## МАЛАДНЯК

### Літ.-мастацкая і грамадзка-палітычная часопіс ЦБ „Маладняка“

Вышаў нумар першы часопісі „Маладняк“ у выданьні ЦК ЛКСМБ і „Чырвонай Зьмены“, вышаў у новай вопратцы— вокладцы, прыгожай, добра выкананай. Цікаўлюся зьместам. Перагортваючы заўважыў дзьве дадатныя рэчы—проза значна выцісвула вершы і яшчэ—увесь нумар наладжаны сіламі самога „Маладняка“.

З вялікім задаваленьнем перачытаў апавяданьне „Зьмітрок“ С. Хурсіка. Напісана проста, а разам чуецца пяро ўзрастаючага мастака.

Ціхая аповесьць героя Зьмітрука аб змаганьні з старым бытам, з дзікім, зачарсьцьвелым бацькам, эпізод з грамадзянскае вайны, дзе мы бачым Зьмітрука сапраўдным героем і разам—салдатам рэвалюцыі, яго вялікая драма з-за Настулькі—усё гэта падана добра па агульным фоне летняе вясковае прыроды.

Ня менш цікава і апавяданьне Р. Мурашкі—прыгодніцкага жанру „Прыгранічны манастыр“. Сюжэт узяты з жыцьця нашых вартаўнікоў—асаблівых у прыгранічнай паласе. І камсамолец і дарослы з задавальненьнем прачытае гэта апавяданьне.

Неяк не здавальняе мяне „Дзікі сьмех“ (вершы ў прозе) Паўлюка Труса. Добрая, стыльная мова, але самая форма напупол-містычная, дый сюжэт пяшчаснай прастытуткі з дочак загінутага ў рэвалюцыі памешчыка досыць закоўваны.

Далей ідзе „Кнак“ П. Галавача. Заўважваю дасягненьні ў мове аўтара—больш жывая, як у мінулых творах. Наогул жывы малюнак з вясковага быту, тэма—няўдалае сватаўство.

Вершы, зьмешчаныя—слабей прозы. Новыя імёны—Нюрыя, Шаўрук, Мікуліч. Робіць добрае ўражаньне верш Надзі Маркавай, „Восеньню мігаюць вочы“ і „Паўстаньне вершаў“ Юшкевіча.

Крытычны нарыс „На шляхох беларускай пралетарскай літаратуры“ М. Аляхновіча гаворыць аб тым, што Маладняк у сваіх шэрагах пачынае выхоўваць і пралетарскіх крытыкаў. Аўтар сьмела стаў на пазыцыі Вапнаўтым змаганьні на літаратурным фронце, якое ідзе як у РСФСР, так і ў нацыянальных рэспубліках.

Нарыс М. Касьпяровіча аб мастацтве нашых суседзяй Латвіі, Эстоніі і Літвы, рэч вельмі патрэбная, заканчвае першы нумар.

Увесь нумар сьведчыць аб тым, што Маладняк ня спыніецца на шляху паглыбленьня працы—у палўнасьці вынікі гэтай працы, як адносна формы, так і зьместу.

Гэты нумар часопісі знойдзе свайго чытача.

А. Садовіч.

## Паведамленьні

— У суботу, 4-га лютага, а 7 гадзі-